# Зладзіць лесвіцу ў неба

## Алегорыя формулы поспеху

**Канец года — час справаздач. "Падвядзенне вынікаў" традыцыйна прайшло і ў лаўрэатаў і дыпламантаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Іх справаздачны канцэрт адбыўся 19 снежня ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі.**

Узрушана-святочны настрой стварыла жвавае па тэмпе і каларытнае па рэпертуары выступленне Беларускага народнага аркестра (кіраўнік — Віктар Валатковіч) Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Удзел у справаздачы яшчэ аднаго калектыву гэтай навучальнай установы — майстэрні эстраднага танца Людмілы і Аляксандра Яфрэмавых — стаўся сапраўднай лірычнай кульмінацыяй канцэрта. За "Міражы" з харэаграфіяй Алёны Акудовіч калектыў атрымаў залаты медаль V Маладзёжных Дэльфійскіх гульняў краін-удзельніц СНД. Дый зараз гэты нумар так расчуліў гледачоў, што артысты былі вымушаны паўтарыць "на біс" самыя адметныя і незвычайныя падтрымкі. А Адажыо "Свеча горела", пастаўленае самой Л.Яфрэмавай, ужо можна лічыць сучаснай класікай. І не толькі з-за песні Алы Пугачовай на верш Барыса Пастэрнака: перададзеная "ў спадчыну" новаму пакаленню моладзі, харэаграфічная кампазіцыя набыла іншыя псіхалагічныя адценні ўзаемаадносін мужчыны і жанчыны. Пакладзены ж на падлогу спартыўны круг, на якім круцяцца артысты, стаў яшчэ больш нагадваць асобную "планету закаханых", дзе проста не хопіць месца "трэцяму — лішняму".

Сярод прадстаўнікоў акадэмічнага мастацтва ўразіла скрыпачка Улада Беражная — той выразнасцю выканання і дакладнасцю штрыхоў, што дазвалялі чуць у ігры і папраўдзе гаваркія фразы, і, часам, гарэзлівае цокание дзявочых абцасікаў. Вельмі прафесійна прагучала складаная арыя з оперы Дж.Вердзі "Макбэт": маладзечанцу Анатолю Сіўко не займаць ні конкурснага, ні сцэнічнага вопыту, назапашанага ў класе Георгія Юрэвіча.

Ды ўсё ж самым выбітным нумарам "высокай класікі" трэба было прызнаць сольны выхад кларнетыста Яўгена Шымановіча. Тым больш, што ён абраў не віртуозна-паказальны твор, а — найскладаную сольную фантазію, дзе не "схаваешся" за акампанемент раяля, не кранеш адно кідкасцю пасажаў ды спеўнасцю мелодый. Разгорнутая п'еса прымусіла публіку ўслухоўвацца-ўжывацца ў кожную ноту, з цікавасцю сачыць за ўсімі перыпетыямі найноўшых выканальніцкіх прыёмаў, якімі валодае далёка не кожны музыкант, а галоўнае — за прыгажосцю кожнага гуку.


Майстэрня эстраднага танца Л. і А. Яфрэмавых.

Стоячы вітала публіка двух маленькіх паветраных гімнастаў узорнай студыі цыркавога мастацтва "Арэна" з Мазыра. Іх выступленне працягвалі іншыя студыйцы, сярод якіх быў і больш старэйшы гімнаст, які не ўзлятаў, падхоплены стужкамі, а засяроджана ладзіў "лесвіцу да нябёсаў", ставячы адзін табурэт на другі і дэманструючы на вярсе кожнага з "навабудаў" чарговую "жывую скульптуру" свайго трэніраванага цела. Раптам падумалася: якая мастацкая алегорыя формулы творчага поспеху! Бо талент — гэта не толькі ўзлёты на хвалі натхнення, але і ўпартая штодзённая праца, без якой узыходжанне змяняецца рэзкім з'ездам уніз.

Але дадзеная "справаздача" была б няпоўнай, калі не згадаць яшчэ адзін канцэрт, што адбыўся напярэдадні. Гэта быў "сольнік" у Камернай зале філармоніі стыпендыята спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, лаўрэата міжнародных конкурсаў Веранікі Прадзед. Арганізатарам канцэрта выступіла сама выканаўца. Сабрала з "кампазітарскіх куфэркаў" арыгінальную музыку для цымбалаў (некаторыя творы, у тым ліку напісаныя 20-годдзе таму, гучалі ўпершыню). Пашыла, у адпаведнасці з рознымі абліччамі інструмента, два новыя сцэнічныя строі — сялянскі і шляхетны. Зацікавіла сваёй ідэяй аднадумцаў: і сярод струннікаў Акадэміі музыкі — склаўшы з іх квінтэт як "праобраз" камернага аркестра, і сярод вакалістаў, у тым ліку народнага аддзялення БДУКіМ. А ў выніку В.Прадзед зрабіла... сапраўднае навуковае адкрыццё: сольныя цымбалы, як аказалася, цудоўна спалучаюцца менавіта з такімі складамі — чалавечым голасам, ансамблем струнных, нават ударнымі. А вось традыцыйны дуэт з фартэпіяна шмат у чым разбурае сутнасць гэтага інструмента, прымушаючы музыкантаў "малаціць" палачкамі, "выбіваючы" з цымбалаў усю "душу".

Ці не на такім падзвіжніцтве трымаецца культура? Гэтую праграму надалей можна з гонарам паказваць на любых сцэнах, у тым ліку замежных.

**Надзея БУНЦЭВІЧ**

**Фота Юрыя ІВАНОВА**


Улада Беражная.


Ансамбль танца "Белая Русь".

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ